# ИСТОРИЯ

УДК 947.2:323.311

**А. А. Дамарад**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

## ПРАБЛЕМА ЛЕГАЛІЗАЦЫІ НЕТЫТУЛАВАНАЙ ШЛЯХТЫ БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ДЗЕЙНАСЦІ ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ XIX СТ.

Захаванне прававога і сацыяльнага статусу для шляхты Беларусі стала адной з прыярытэтных задач у XIX стагоддзі. Псіхалагічна не адаптаваныя да існавання ў новых палітычных умовах, мясцовыя дваране імкнуліся найперш да фактычнай легалізацыі праз удзел у выбарных органах улады і працы на дзяржаўных пасадах. Юрыдычнае замацаванне дваранскага статусу для шляхты Беларусі было аддаленай перспектывай па прычыне непадрыхтаванасці адпаведных дзяржаўных установаў да сур'ёзнай працы, карупцыі, недахопу дакументаў. З іншага боку, вышэйшае кіраўніцтва Расіі мела вопыт і канкрэтныя прычыны для тармажэння легалізацыі шляхты.

**Ключавыя словы:** Расійская імперыя, Герольдыя, законы, шляхта, дваранства, дзяржаўная палітыка.

**A. A. Damarad**
Belarusian State Technological University

## THE PROBLEM OF LEGALIZATION OF THE BELARUSIAN GENTRY IN THE CONTEXT OF THE ACTIVITIES OF STATE BODIES IN THE RUSSIAN EMPIRE IN THE 19TH CENT.

Saving the legal and social status of the gentry of Belarus became one of the priorities of the 19th century. Psychologically, are not adapted to living in the new political environment, local nobles sought above all to the actual legalization through participation in elected bodies and work in local government positions. Legal status was a distant prospect for the consolidation of noble gentry of Belarus due to unpreparedness of relevant government agencies to serious work, corruption, lack of documents. On the other hand, the top authorities of Russia had the experience and the specific reasons for the deceleration of the nobility legalization.

**Key words:** Russian Empire, Herold, laws, gentrys, the nobility, state polisy.

**Уводзіны.** Мясцовае дваранства Беларускіх губерняў разглядалася расійскімі ўладамі гістарычна як частка расійскага, што фармальна павінна было ўключаць першае ў склад апошняга проста аўтаматычна. Але на практыцы ўсё аказалася значна складаней. Дзяржаўная адміністрацыя імкнулася да колькаснага скарачэння шляхты.

Расійскія ўлады мелі адпаведны вопыт здзяйснення падобнай працэдуры. У больш сціслых маштабах інтэграцыя шляхты ў склад дваранства Расійскай імперыі адбылася ў межах Смаленскага ваяводства, якое перайшло да Расіі ў выніку вайны з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. Смаленская шляхта доўгі час была адмысловай ускраіннай групай вышэйшага саслоўя ў царстве, а потым у імперыі і захоўвала значныя юрыдычныя і бытавыя адрозненні ад ўласнарускага дваранства. У XVII ст. для кіравання ёй быў створаны асобы Прыказ княства Смаленскага, які падпарадкоўваўся спачатку Стралецкаму, а потым Пасольскаму прыказу. Частка смаленскай шляхты па прычыне недахопу свабоднай зямлі была перасялена за раку Каму, ва Уфімскі уезд (потым Арэнбургскай губерні), але і там працягвала называць сябе «смаленскай шляхтай». Асаблівае становішча смаленскага шляхецтва было замацавана шасцю царскімі граматамі, выдадзенымі ў 1654–1694 гг., якія гарантавалі ягоныя зямельныя правы, а таксама своеасаблівы службовы лад. Смаленская шляхта складала асобы конны полк – «полк смаленскай шляхы». На чале палка у XVII ст. стаяў палкоўнік, а ў XVIII ст. – нават генерал. Палкавая канцылярыя называлася «канцылярыя генеральнага праўлення смаленскай шляхты», на пасады ў якой Сенатам прызначаліся асобы з ліку кандыдатур, адобраных смаленскай шляхтай. У асноўным імі станавіліся прадстаўнікі вядомых шляхецкіх родаў: Друцкіх-Сакалінскіх, Корсакаў, Швыйкоўскіх, Ванлярскіх, Пацёмкіных. Да сярэдзіны XVIII ст.

нароўні з «маскоўскімі», у Смаленскім палку існаваў чын рэгементара-палкоўніка, ротмістра, харунжага, што засталіся ў спадчыну ад Вялікага княства Літоўскага. Захоўваўся таксама і парадак ваеннай службы. Смаленская шляхта, як і ў Рэчы Паспалітай, не атрымлівала за службу ад дзяржавы жалавання, а ўтрымлівалася выключна за кошт сваіх зямель. Але ўжо пачынаючы з сярэдзіны XVIII ст. дзяржаўная служба не была для смаленскай шляхты абавязковай, што значна адрознівала яе ад астатняга расійскага дваранства. Тады ж можна назіраць значную маёмасную дыферэнцыяцыю смаленскай шляхты. Губернатар князь Абаленскі пісаў у Пецярбург: «Хотя все шляхтичи желают служить в своем полку, но за убожеством их не только платье, в ружье и лошадях, как надлежит шляхтичу исправно себя содержать, но оные из них и пропитания не имеют. Да и при смотре и разборе многие были пешие и в лаптях и в крестьянских серых кафтанах». У 1746 г. камандзір палка смаленскай шляхты Лярскі паведамляў Сенату: «А оные шляхетство скитаются по разным местам меж чужих двор, питаясь подаянием милостыни» [1, с. 93]. У цэлым смаленская шляхта разумела свой асаблівы статус і імкнулася захаваць адасобленасць ад астатняга дваранства. У 1748 г. па яе патрабаванню Сенат загадаў выключыць з ліку смаленскай шляхты тых, хто не меў дакументальных доказаў аб кроўнай да яе належнасці. Прадстаўнікі смаленскай шляхты падтрымлівалі роднасныя сувязі са шляхтай суседніх абласцей Рэчы Паспалітай. Заможныя смаленскія роды ў XVII–XVIII стст. аддавалі сваіх дзяцей на навучанне за мяжу ў езуіцкія ўстановы Полацка, Оршы, Віцебска. Са свайго боку расійскія ўлады ўвогуле сачылі за канфесійнай прыналежнасцю смаленскай шляхты, у прыватнасці, перашкаджалі распаўсюджанню сярод яе каталіцтва. Так, у 1728 г. Вярхоўны Тайны Савет выдаў два ўказы, паводле якіх забаранялася аддаваць дзяцей на навучанне ў Рэч Паспалітую і забаранялася ўступаць у шлюб з жанчынамі каталіцкага веравызнання з-за мяжы і аддаваць дачок замуж за каталікоў.

У выніку гэтых мерапрыемстваў у XVIII ст. смаленская шляхта была аддалена ад каталіцкай адукацыі і каталіцкай веры, згубіла роднасныя сувязі з блізкім замежжам, і таму, нягледзячы на ўсе спробы самазахавання, паступова русіфікавалася. Паспрыяла гэтаму і выданне у 1764 г. Кацярынай II указа, якім быў ліквідаваны Полк смаленскай шляхты як асобная ваенна-шляхецкая карпарацыя. Таму ў выніку распачатых расійскімі ўладамі мераў у другой палове XVIII ст. смаленская шляхта паступова зліваецца з агульнай масай расійскага дваранства і страчвае свае адметныя асаблівасці.

Такім чынам, яшчэ напярэдадні далучэння да Расійскай імперыі беларускіх зямель Санкт-Пецярбург ужо меў вопыт па інкарпарацыі шляхты новадалучаных тэрыторый у расійскае дваранства.

**Асноўная частка.** У дваранскіх дэпутацкіх сходах беларускіх і літоўскіх губерняў легалізацыя шляхецкай годнасці адбывалася дастаткова паслядоўна. Грунтаваліся гэтыя рашэнні на прадстаўленых доказах.

У Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях працэс пацверджання шляхецкага паходжання быў доўгім, але, у адрозненне ад губерняў Віленскай і Гродзенскай, тэрміны тут насілі больш індывідуальны характар. Так, справа аб статусе роду Бялькевічаў цягнулася з 1817 аж да 1886 г. Прычым першапачаткова жыхар засценка Касынічы Слуцкага павета Васіль Данілавіч Бялькевіч быў запісаны ў аднадворцы, аднак гэта атрымалася толькі з прычыны страты дакументаў у выніку пажару, у якім згарэлі актавыя кнігі былога Ашмянскага земскага суда. У якасці доказаў свайго паходжання Бялькевічы прадаставілі копіі з царкоўных метрык, а таксама пасведчанне, выдадзенае ім паводле імператарскага ўказа Мінскай казённай палатай «записанному из дворян в крестьяне Сымону Белькевичу... в том, что по ревизским сказкам Слуцкого уезда за 1795 год показаны в числе шляхты, живущих на землях чиншевых..., и за 1816 год того ж уезда по списку дворянскому в числе шляхты на землях князя Радзивилла» [2, л. 77]. На аснове гэтых дакументаў род Бялькевічаў Мінскім дваранскім дэпутацкім сходам быў зацверджаны ў шляхецкай годнасці яшчэ ў 1817 г. Аднак у Дэпартаменце Герольдыі разгляд справы быў пачаты толькі ў 60-я гг. XIX ст., прычым было прынята адмоўнае рашэнне, абгрунтаванае тым, што апошнія не даказалі факту валодання нерухомай маёмасцю да выдання «Жалаванай граматы дваранству» [2, л. 143, 207]. Зразумела, што апошняй інстанцыяй у гэтым пытанні заставаўся расійскі імператар, які ў 1878 г. «высочайше соизволил на исключение из крестьянского звания… Белькевичей и подтвердил в первобытном их предков дворянском достоинстве» [2, л. 264].

У сваю чаргу, Антон Губарэвіч, родам з Лідскага павета, меў ваенны чын. Ён быў штаб-ротмістрам Украінскага уланскага палка, аднак гэта не дапамагло яму хутка пацвердзіць шляхецкае паходжанне [3, л. 10]. Ягоны брат Станіслаў у пачатку 30-х гг. XIX ст. быў засядацелем Першага дэпартамента Галоўнага гродзескага суда. Гэтая пасада дэфакта азначала прыналежнасць да дваранскага саслоўя, тым больш, што Губарэвічы карысталіся распаўсюджаным гербам «Радван» і ў 1828 г. былі прызнаны дваранскім сходам у дваранскай годнасці [3, л. 11].

Аднак юрыдычнага замацавання свайго статусу ў Герольдыі яны, відаць, не атрымалі, паколькі ў архіўнай справе няма ніякіх згадак пра гэта.

У 1841 г. канчаткова зацвердзілі свой дваранскі статус Дамброўскія з Расіенскага павета. Прычым галоўным доказам гэтага было тое, што «Домбровские действительно происходят от показанных родителей дворянского происхождения, и все они подушным обкладом незаняты, и в числе однодворцев не записаны, к бывшему же в 1831 г. мятежу не принадлежали, а потому Павел-Степан и Константин сыновья Степана к выше означенному [дваранскаму саслоўю – А. Д.] могут быть сопричислены» [4, л. 13]. Яшчэ цікавей адбывалася прызнанне шляхецтва роду Машэўскіх. Гэтая фамілія атрымала пацверджанне ў дваранстве ў Земскім судзе Полацкай правінцыі 22 сакавіка 1773 г. і ў Літоўскім дваранскім сходзе 16 сакавіка 1798 г. Паколькі ў XIX ст. дадзеныя тэрытарыяльныя адзінкі ўжо не існавалі, 5 мая 1821 г. Гродзенскі дваранскі дэпутацкі сход пастанавіў, на падставе ранейшых рашэнняў, унесці род Машэўскіх у 6-ю частку губернскай радаводнай кнігі [5, л. 11]. У сваю чаргу, Пясецкія з Лідскага павета прадставілі ў якасці аднаго з доказаў прывілей караля Аўгуста II на званне вознага, нададзенага продку іх Казіміру ў 1724 г., а таксама яшчэ і дакумент, які пацвярджаў права ўласнасці Антона Пясецкага на 3-ю частку родавага маёнтка. Гэтыя доказы леглі ў аснову рашэння дваранскага дэпутацкага сходу 1829 г. аб прызнанні Пясецкіх у дваранстве і ўнясенні ў першую частку радаводнай кнігі Гродзенскай губерні. Цікава, але праз тры гады, у 1832 г., гэты род канчаткова быў зацверджаны ў шляхецкай годнасці. Дастаткова характэрным было прызнанне дваранства роду Шалевічаў. Казімір Шалевіч, які пісаўся «бывшим Лидским уездным хорунжим», меў сына Франца-Рудольфа. Гэты прадстаўнік свайго роду ў 20 год стаў навучэнцам у вучылішчы Інжынераў у Санкт-Пецярбургу [6, л. 22]. Сярод прадстаўленых доказаў на дваранства гэтая шляхецкая фамілія мела дакумент, які пацвярджаў валоданне маёнткам у Лідскім павеце, у якім паводле рэвізіі пражывала 64 душы [6, л. 22]. Паколькі Шалевічы мелі ўсе неабходныя дакументы, 15 сакавіка 1841 г. указам Герольдыі яны былі зацверджаны ў расійскім дваранстве. Зразумела, што на шляху інтэграцыі ў склад дваранства Расійскай імперыі пацверджаннем свайго шляхецтва яны пераадолелі толькі першую ступень. Навучаннем дзяцей у сталіцы Расійскай імперыі Казімір Шалевіч не абмежаваўся. Ягоны другі сын Адольф стаў чыноўнікам у г. Таганрогу [6, л. 23].

Паказаныя прыклады выдатна ілюструюць доўгі працэс легалізацыі дваранскага статусу на агульнадзяржаўным узроўні. Фактычна, адсутнасць неабходнага фармальнага статусу перашкаджала інтэграцыі шляхты беларускіх земель у склад дваранства Расійскай імперыі. З іншага боку, допуск асоб, якія не мелі зацверджанага Герольдыяй дваранства, да дваранскіх пасад і званняў сведчыў аб фактычнай інтэграцыі прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя «літоўскіх» і «беларускіх» губерняў. Так, Мікалай Антонавіч Грамыка быў тытулярным саветнікам, Іван Ільіч – меў званне капітана, а Пётр Грамыка ў 1870-х гг. служыў у чыне тытулярнага саветніка «канцелярским чиновником Могилёвского губернского управления государственных имуществ» [7, л. 37]. Міхаіл Міхаілавіч Грамыка акрамя таго, што меў званне палкоўніка, займаў пасаду начальніка Смаленскага губернскага жандарскага ўпраўлення [7, л. 4]. Такі кар'ерны рост, калі з 1865 г. да канца XIX ст. звычайны шляхціц узначальвае губернскую жандармерыю, сведчыць, па-першае, пра сапраўдную інтэграцыю не толькі ў склад дваранства, але і ў дзяржаўна-палітычную сістэму, а па-другое, пра дастаткова вялікую ступень даверу расійскіх уладаў да прадстаўнікоў «былой польскай шляхты».

Што датычыцца дзяржаўнай службы, то шляхта беларускіх зямель у цэлым не апраўдала спадзяванняў урада, паколькі мясцовыя шляхціцы са значна большым жаданнем займалі менавіта выбарныя дваранскія пасады. Гэта, безумоўна, стрымлівала інтэграцыю шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі, паколькі служба ў якасці чыноўніка давала добрую магчымасць кар'ернага росту, атрымання чыноў і ўзнагарод, якія дазвалялі вырашыць праблему сацыяльна-прававой легалізацыі. Цікава, што ў карэнных расійскіх губернях усё было з дакладнасцю да наадварот. Там на пачатак XIX ст. склалася парадаксальная сітуацыя: нават захады ўрада па замяшчэнні незанятых выбарных пасад прызначанымі чыноўнікамі і ўраўнанне чыноў дзяржаўнай і выбарнай службы не дасягнулі поспеху. Адваротную сітуацыю ў беларускіх губернях С. А. Корф тлумачыў проста больш высокім культурным узроўнем мясцовай шляхты, лепшай адукацыяй, большай карпаратыўнасцю [8, с. 193]. Так, мясцовыя дваранскія маршалкі пры сусрэчах імператара Аляксандра I трымаліся з гонарам, а прадвадзіцелі ў расійскіх губернях больш нагадвалі афіцыянтаў, паколькі баяліся прамовіць слова. На наш погляд, адзначаныя «перажыткі» з часоў Рэчы Паспалітай, скіроўвалі нетытулаваную шляху да ўдзелу ў дваранскіх выбарах, паколькі атрыманыя пасады станавіліся дэ-факта шляхам для ўваходжання ў дваранства Расійскай імперыі. Сучаснымі даследчыкамі была зроблена выснова, што для незаможнай нетытулаванай шляхты выбарныя пасады (асабліва ў судовых органах) станавіліся пэўнай крыніцай узбагачэння. Так, паводле выбараў 1785 г. у Полацкім, Віцебскім, Дры-

сенскім, Суражскім і Гарадоцкім паветах з 20 засядацеляў павятовых і ніжніх земскіх судоў 11 чалавек мелі ў сярэднім да 30 душ прыгонных.

**Заключэнне.** Такім чынам, праблема легалізацыі нетытулаванай шляхты Беларусі засяроджвалася вакол фактычнага прызнання дваранскага статусу праз уключэнне ў дзейнасць адміністрацыйных і выбарных дзяржаўных органаў. Прызнанне правоў на афіцыйным узроўні стала дастаткова аддаленай перспектывай для нетытулаванай шляхты Беларусі па прычыне яе эканамічнай слабасці, а таксама з-за сумніўнай рэпутацыі, якая дапаўнялася слабымі фармальнымі прыкметамі дваранства. Таму фактычная інтэграцыя ў склад расійскага дваранства апярэджвала дакументальную.

## Літаратура

1. Жукович П. Н. Дворянство, крестьянство и мещанство в западно-русских областях, присоединенных по второму и третьему разделу // ЖМНП. 1915. № 5. С. 87–145.

2. НГАБ. Ф. 319. Воп. 2. Спр. 376 [О дворянском происхождении рода Белькевичей].

3. ЛДГА. Ф. 391. Воп. 5. Спр. 215 [Дело о дворянском происхождении рода Губаревича Лидского уезда].

4. ЛДГА. Ф. 391. Воп. 5. Спр. 106 [Дело об установлении дворянского происхождения рода Добровольских Россиенского уезда (1817–1841)].

5. ЛДГА. Ф. 391. Воп. 5. Спр. 403 [Дело о дворянском происхождении рода Машевских].

6. ЛДГА. Ф. 391. Воп. 5. Спр. 650 [Дело об установлении дворянского происхождения рода Шалевичей Лидского уезда].

7. РГИА. Ф. 1343. Оп. 35. Д. 6669 [О дворянстве рода Дробышевских].

8. Корф С. А. Дворянство и его сословное управление за столетие (1762–1855 гг.). СПб., 1906.

## References

1. Zhukovich N. P. The nobility, the peasantry and the petty bourgeoisie in the West Russian regions, connected to the second and third section. *ZhMNP* [Journal of Ministry of National Education], 1915, no. 5, pp. 87–145 (In Russian).

2. NHARB. Fund 319. Minsk deputy assembly. I. 2. F. 376 [The case for the nobility origin of Belkevich family].

3. LSHA. Fund 391. Vilno deputy assembly. I. 5. F. 215 [The case for the nobility origin of Gubarevich family from Lida district].

4. LSHA. Fund 391. Vilno deputy assembly. I. 5. F. 106 [The case for the nobility origin of Dobrovolski family from Raseiniaj district 1817–1841].

5. LSHA. Fund 391. Vilno deputy assembly. I. 5. F. 403 [The case for the nobility origin of Mashevski family].

6. LSHA. Fund 391. Vilno deputy assembly. I. 5. F. 650 [The case for the nobility origin of Shalevich family from Lida district].

7. RSHA. Fund 1343. Geroldy council. I. 35. F. 6669 [The case for the nobility origin of Drobyshevski family].

8. Korf S. A. *Dvoryanstvo i yego soslovnoye upravleniye za stoletiye (1762–1855 gg.)* [The nobility and the estates management in a century 1762–1855]. St. Petersburg, 1906.

## Информация об авторе

**Дамарад Аляксей Анатольевіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: domorad@belstu.by

## Information about the author

**Damarad Aliaksei Anatolievich** – PhD (History), Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: domorad@belstu.by

*Паступіў 15.03.2016*